# Ядвігін Ш.(Антон Іванавіч Лявіцкі)

4 студзеня 1869 – 24 лютага 1922

# Дзяцінства

Нарадзіўся ў маёнтку Добасна Рагачоўскага павета у сям'і упраўляючага маёнтка. Меў сястру Эву. Пазней бацька з сям'ёй пераехаў у Міншчыну.

Там Ядвігін вучыўся ў прыватнай школе, арганізаванай дачкой Дуніна-Марцінкевіча(ў фальварку Люцынка). Потым скончыў Мінскую гімназію і паступіў у Маскоўскі універсітэт на медыцынскі факультэт.

# Студэнцкія годы і арышт

Антось вучыўся ў універсітэце ў час забойства Аляксандра II. Таму ён быў на студэнцкіх выступленнях.

8 сакавіка 1890 г. яго арыштавалі(бунт сярод студэнтаў Пятроўска-Разумоўскай сельскагаспадарчай акадэміі).

Ядвігіна памясцілі ў Бетырках разам з іншымі студэнтамі. Там яны выпускалі рукапісную газету і вырашылі заснаваць першы гурток моладзі у Маскве. У гэты час ён пераклаў «Сігнал».

# Станаўленне аптэкарам і вяртанне ў Беларусь

Пасля вызвалення Ядвігіну не далі вернуцца ва універсітэт. Таму ён здаў экзамен на аптэкарскага практыканта і працаваў у Беларусі памочнікам правізара(мястэчка Радашковічы). Там жа быў гурток беларусаў-інтэлегентаў, у які ступіў Ядвігін.

У 1892г. Ядвігін напісаў камедыю «Злодзей», але паставіць п’есу не здалося – пракурор даведаўся пра яе і таму п’еса засталася адной з рукапісаў.

У 1897г. Лявіцкі заняўся садоўніцтвам, тут ён працягвае пісаць, але многія творы «адлежваюцца ў шуфлядзе».

# Публіцысціка

У 1894г. у віленскіх і мінскіх рускіх прагрэсіўных газетах Ядвігін пісаў на рускай мове пра Беларусь і яе фальклор.

Пасля рэвалюцыі ў 3 номеры газеты «Наша доля» надрукавалі першае апавяланне Антося на беларускай мове – «Суд». У гэты час ён многа пісаў у газеты «Наша доля» і «Наша ніва». У 1912г. і 1914г. выходзяць зборнікі «Бярозка» і «Васількі».

# У час вайны і пасля яе

Вясной 1914г. Ядвігін пераехаў у Мінск, дзе быў рэдактарам газет(«Саха», «Лучынка») і арганізатарам Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны. У гэты час ён працаваў у Мінскім цэнтральным бюро працы і кіраўніком пашывачных майстэрняў па ваеннаму абмундзіраванню. Таму Антось атрымаў хваробу. Пасля Мінскага шпіталя пераехаў у Карпілаўку. Многія рукапісы пісьменніка загінулі ў час вайны.

У 1920г. Выпускае нескончаны твор «Золата» і незакончаныя «Успаміны».

# Даведачныя матэрыял

- karotkizmest.by
- be.wikipedia.org
- imperiaduhu.by
- sputnik.by